УДК 261.4

**В. А. Адзіночанка**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Гомель*

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ РЭЛІГІЙНАЙ СІТУАЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ, ШЛЯХІ

Мы імкнёмся разгледзець трансфармацыю рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі не толькі праз суадносіны цяперашняга і мінулага стану, але і праз перспектыву будучага. Гэтым абумоўлены праблемны характар нашых разважанняў. Змены, якія адбыліся, відавочныя. Але актуальнымі з'яўляюцца спробы высвятлення таго, што будзе далей.

Перш за ўсё лічым неабходным удакладніць характар праблемнасці. На ўзроўні штодзённай свядомасці прынята лічыць, што будучае — гэта тое, чаго няма, таму разважанні аб ім маюць верагоднасны характер. Але такое сцвярджэнне з'яўляецца абстрактным, таму яно праўдзівае толькі часткова. Па-першае, трэба выявіць ступень верагоднасці тых ці іншых падзей. Яна задаецца наяўнымі працэсамі і тэндэнцыямі. Па-другое, развіццё грамадства не з'яўляецца спантанным і мае мэтанакіраваны характар. Сучасная Беларусь ідзе да пабудовы рынкавай эканомікі, дэмакратыі, плюралізму думак, ажыццяўлення правоў чалавека. Таму наша будучае, у тым ліку і ў рэлігійнай сферы, не з'яўляецца цалкам неакрэсленым. Праблему ж мы бачым у тым, як дасягнуць пазначаных мэтаў.

Актуальнасць даследавання трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі абумоўлена пераходным станам, у якім зараз знаходзіцца краіна. Умоўна яго можна акрэсліць як пераход ад Савецкага Саюза да незалежнай дзяржавы.

Падкрэслім такі відавочны факт, што ён не адбываецца аўтаматычна, падобна прыродным працэсам, але ажыццяўляецца праз дзейнасць розных грамадскіх інстытутаў. Зараз відавочна заўважнымі з'яўляюцца намаганні беларускай дзяржавы ў гэтым накірунку. Прыняты шэраг праграм развіцця, у тым ліку і ў рэлігійнай сферы.

Гэтым абумоўлены падыходы да аналізу працэсу трансфармацыі рэлігійнай сферы ў сучаснай Беларусі. Ён павінен мець канкрэтны характар і абапірацца на трактоўку грамадскай сітуацыі, якая існуе ў краіне. Таму трэба выходзіць з магчымасці праблематызацыі любых высноў і рэкамендацый. Плюралізм меркаванняў у гэтым выпадку з'яўляецца не проста добрым пажаданнем, але неабходнасцю. Толькі пры яго наяўнасці магчыма карэкціроўка дзейнасці. Адзначым, што рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі не з'яўляецца адназначнай і патрабуе для свайго аналізу некалькі падыходаў.

Тэрмін «перспектыва» ўказвае, па-першае, на спосаб бачання рэчаіснасці: яно адбываецца з якога-небудзь месца; па-другое, на прадбачанне, выяўленне рысаў будучага. Мы зыходзім з таго, што любое ўспрыманне рэчаіснасці павінна быць укаранёным у прасторы і часе, толькі тады яно набывае сэнс. Абстрактныя разважанні прыводзяць да абстрактных вынікаў і маюць вельмі ўскоснае дачыненне да штодзённых праблем і дзеянняў людзей.

Таксама адзначым, што лакалізацыя перспектыўнага бачання мае не столькі геаграфічны, колькі сэнсавы характар. Зараз адбываецца трансфармацыя беларускага грамадства і фарміруюцца розныя падыходы да аналізу сітуацыі. З іх пункту погляду могуць быць розныя трактоўкі мінулага, цяперашняга і будучага рэлігіі ў нашай краіне, прычым плюралізм трактовак не толькі дапушчальны, але і патрэбны. Немэтазгодна, каб пастулявалася адзіная правільная ісціна і шлях развіцця. Узаемадзеянне паміж рознымі падыходамі забяспечвае магчымасць больш поўнага бачання перспектыў трансфармацыі рэлігійная сітуацыі, іх сістэмнасць.

Зараз для нас жа актуальным з'яўляецца канцэнтрацыя менавіта на беларускім пункце погляду, бо вельмі часта ён традыцыйна падмяняецца расійскім. У галіне рэлігіязнаўства гэта, у прыватнасці, праяўляецца ў тым, што пры разглядзе гісторыі хрысціянства на нашых землях спачатку кажуць пра хрышчэнне Русі князем Уладзімірам, а потым пункт погляду неяк плаўна перамяшчаецца ў Маскву, і разважанні вядуцца як быццам бы адтуль. Між тым гісторыя рэлігіі ў Беларусі мае свае яскрава выражаныя адметнасці. Гэта, напрыклад, узаемадзеянне розных хрысціянскіх канфесій, Рэфармацыя, дзейнасць каталіцкіх ордэнаў. Адзначым, што нават гісторыя праваслаўя на тэрыторыі Беларусі мае сваю спецыфіку ў параўнанні з Расіяй. Тое ж самае тычыцца і сучасных трактовак працэсаў рэлігійнай глабалізацыі, характару ўплыву на нацыянальную культуру розных канфесій, прынцыпаў узаемаадносін дяржавы з рэлігійнымі арганізацыямі і г. д. Яны павінны адбывацца на падставе аналізу рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі, а не за яе межамі.

Мы можам назваць канкрэтныя падзеі, ад якіх вядзе свой адлік гісторыя сучаснай Беларусі. Гэта прынясцце ў 1991 г. Вярхоўным Саветам БССР акту аб дзяржаўным суверэнітэце. Быў пакладзены пачатак развіццю новай незалежнай дзяржавы. Такім чынам, сучаснасць для Беларусі вызначаецца праз працэсы трансфармацыі.

© Адзіночанка В. А., 2018

У гэтай сувязі мы павінны ўлічваць спецыфіку тых працэсаў, якія адбываюцца пры трансфармацыі сацыяльнай сістэмы. Акцэнт трэба рабіць не на змены ў розных галінах жыцця, але на тое, што мяняецца само грамадства. Як падкрэслівае член-карэспандэнт НАН Беларусі А. М. Данілаў, паняцце «трансфармацыя» выкарыстоўваецца «для апісання радыкальных структурных пераменаў. Яно выражае пераход да якасна новага стану» [1, с. 9].

Пры дапамозе паняцця «сітуацыя» мы выяўляем рысы нашага сучаснага грамадства. Сітуацыя, па-першае, мае характар наяўнасці, яна аб'ектыўная. Па-другое, гэта тое, што склалася ў выніку чалавечай дзейнасці і, адпаведна, прадугледжвае магчымасць зменаў. Сітуацыя не можа быць адной і той жа, гэта вядзе да стагнацыі грамадства, прычым змены могуць мець як частковы, так і радыкальны характар, у апошнім выпадку мы кажам пра трансфармацыю. Па-трэцяе, сітуацыя заўсёды канкрэтная і мае акрэсленыя змястоўныя і прасторава-часавыя характарыстыкі. Мы разглядаем трансфармацыю рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі. Пры гэтым зыходзім з таго, што рэлігійная сітуацыя — гэта «сукупнасць дынамічных абставін, якія склаліся пад уплывам рэлігійнасці і праяўляюцца ў рэлігійных формах» [2, с. 29].

Працэсы трансфармацыі, якія шмат у чым вызначаюць нашае жыццё, абумоўлены пераходам ад савецкага грамадства да нейкага іншага, канкрэтныя рысы якога ў Беларусі яшчэ толькі фарміруюцца. Змены ў рэлігійнай сферы ў апошнія гады з'яўляюцца бадай што найбольш радыкальнымі. Стаўленне да рэлігіі ў Савецкім Саюзе было абумоўлена перш за ўсё пануючай ідэалагічнай устаноўкай, згодна з якой рэлігія абвяшчалася адзінай легальна існуючай у савецкім грамадстве формай антыкамуністычнай ідэалогіі і перажыткам мінулага. Спецыфіка сітуацыі заключалася ў тым, што пры ўсёй жорсткасці палітыкі барацьбы з рэлігіяй у краіне ўсё адно заставаліся веруючыя людзі, дзейнічалі рэлігійныя суполкі і масава святкаваліся такія святы, як Пасха і Радаўніца.

Як правіла, савецкая сітуацыя — гэта той пачатковы ўзровень, з якога даследчыкі выходзяць пры аналізе працэсу трансфармацыі рэлігійнай сферы ў сучаснай Беларусі. Пазначаюцца дзве асноўныя тэндэнцыі. Па-першае, паступова, але няўхільна пашыраецца рэлігійная сфера грамадскага жыцця. Найбольш яскравым паказчыкам гэтага з'яўляецца павелічэнне колькасці зарэгістраваных рэлігійных суполак. З савецкіх часоў яна ўзрасла больш чым у чатыры разы: з 765 на пачатак 1988 г. да 3 358 у пачатку 2018 г.

Для ілюстрацыі прывядзём наступныя звесткі (табліца 1).

Т а б л і ц а 1 — Колькасць зарэгістраваных рэлігійных суполак

| Год | 1988 | 1990 | 1995 | 2000 | 2005 | 2010 | 2018 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць | 765 | 939 | 1 865 | 2 518 | 2 829 | 3 106 | 3 358 |

Па-другое, змяніўся сам пункт погляду, з якога трактавалася рэлігія. У Савецкім Саюзе ён задаваўся ідэалогіяй, зараз рэлігія тлумачыцца пераважна з культуралагічнага пункту погляду як неад'емная частка нацыянальнай культуры і аснова маральнасці. Такім чынам, стаўленне да рэлігіі памянялася на супрацьлеглае.

У той жа час мы лічым, што разгляд рэлігіі праз яе сацыяльныя функцыі, у тым ліку і рэгулюючую, з'яўляецца адным з магчымых і павінен быць дапоўнены іншымі, бо, напрыклад, хрысціянства не лічыць сваёй асноўнай задачай узмацненне маральнасці ў грамадстве або фарміраванне культурных каштоўнасцей. Таму пры разглядзе праблем, перспектыў і шляхоў трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі трэба ўлічваць пазіцыю не толькі дзяржавы, але і саміх рэлігійных арганізацый.

Асаблівасцю беларускага заканадаўства з'яўляецца тое, што ў ім адсутнічае прынцып аддзялення рэлігіі ад дзяржавы. У арт. 16 Канстытуцыі запісана: «Узаемадзеянні дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа» [2, с. 8]. Гэтае палажэнне Канстытуцыі было замацавана ў прынятай у 2002 г. новай рэдакцыі закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». У яе прэамбуле сказана: «Гэты Закон... вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, зыходзячы з: …прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа; духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі; неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангеліцка-лютэранскай царквы, іўдаізму і ісламу» [3, с. 3].

У гэтых палажэннях яўна прасочваецца імкненне да збліжэння з Расіяй, якое было характэрна для кіраўніцтва Беларусі ў пачатку нулявых гадоў.

Мы лічым, што той падыход, які выкарыстоўваецца ў прэамбуле, не адпавядае беларускім рэаліям. На нашых землях доўгі час жылі прадстаўнікі самых розных канфесій, якія зрабілі свой унёсак у развіццё нацыянальнай культуры. Таму трэба рабіць націск на традыцыйную поліканфесійнасць, а таксама талерантнасць беларусаў. Сучасную рэлігійную сітуацыю ў Беларусі, а таксама яе развіццё ў апошнія гады ілюструе наступная табліца, у якой паказана колькасць зарэгістраваных рэлігійных суполак той ці іншай канфесіі ў розныя гады:

| Назва канфесіі | Год | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1988 | 1990 | 1995 | 2000 | 2005 | 2010 | 2018 |
| Праваслаўная царква | 399 | 477 | 902 | 1 139 | 1 315 | 1 509 | 1 687 |
| Стараверская царква | 22 | 22 | 29 | 25 | 33 | 32 | 34 |
| Рымска-каталіцкая царква | 121 | 170 | 352 | 405 | 433 | 470 | 497 |
| Каталікі лацінскага абраду | 0 | 0 | 0 | 2 | 1 | 1 | 1 |
| Грэка-каталіцкая царква | 0 | 0 | 11 | 13 | 13 | 14 | 15 |
| Рэфармацкая царква | 0 | 0 | 1 | 1 | 2 | 1 | 1 |
| Лютэранская царква | 0 | 0 | 3 | 5 | 22 | 27 | 27 |
| Евангельскія хрысціяне-баптысты | 171 | 109 | 183 | 244 | 257 | 272 | 281 |
| Іаганская царква | 0 | 0 | 2 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Новаапостальская царква | 0 | 0 | 11 | 20 | 20 | 21 | 21 |
| Прэсвітэрыянская царква | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 1 |
| Хрысціяне веры евангельскай | 39 | 144 | 261 | 443 | 482 | 501 | 521 |
| Хрысціяне поўнага Евангелля | 0 | 0 | 17 | 54 | 55 | 55 | 59 |
| Хрысціяне веры апостальскай | 0 | 0 | 8 | 9 | 10 | 9 | 11 |
| Царква Хрыстова | 0 | 0 | 4 | 6 | 5 | 5 | 5 |
| Месіянскія суполкі | 0 | 0 | 2 | 2 | 2 | 2 | 3 |
| Адвентысты сёмага дня | 11 | 15 | 26 | 48 | 69 | 72 | 73 |
| Сведкі Іеговы | 0 | 0 | 6 | 21 | 26 | 26 | 27 |
| Мармоны | 0 | 0 | 3 | 3 | 3 | 4 | 4 |
| Іўдзейская рэлігія | 1 | 1 | 15 | 20 | 27 | 30 | 38 |
| Прагрэсіўны іўдаізм | 0 | 0 | 0 | 8 | 17 | 16 | 14 |
| Мусульманская рэлігія | 1 | 1 | 15 | 24 | 24 | 25 | 24 |
| Бахаі | 0 | 0 | 3 | 6 | 5 | 5 | 5 |
| Крышнаіты | 0 | 0 | 5 | 7 | 5 | 6 | 6 |
| Армянская апостальская царква | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 2 |

Найбольш шматлікай рэлігійнай арганізацыяй у сучаснай Беларусі з'яўляецца Беларуская праваслаўная царква. Яна ж дэманструе і найбольшы рост у абсалютных лічбах. Але, на наш погляд, пры аналізе перспектыў трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі ў краіне трэба звярнуць увагу на тэндэнцыі росту такіх пратэстанцкіх цэркваў, як Евангельскія хрысціяне-баптысты, Хрысціяне веры евангельскай і Адвентысты сёмага дня. Справа ў тым, што для іх характэрны націск на місіянерскую дзейнасць, патэнцыял якой у сучаснай Беларусі, на наш погляд, не вычарпаны. Таму пры трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі ў Беларусі трэба чакаць павелічэння колькасці пратэстанцкіх суполак.

Праблемным таксама з'яўляецца пытанне аб колькасці прыхільнікаў той ці іншай канфесіі ў сучаснай Беларусі. Сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што пераважная частка насельніцтва краіны залічвае сябе да той ці іншай канфесіі. Апытанне, праведзенае ў маі—чэрвені 2016 г. Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, паказала, што «з праваслаўем сябе атаясамліваае 78,3% рэспандэнтаў, з каталіцтвам — 9,5%, з пратэстанцтвам — 0,9%, з ісламам — 0,5%» [4, с. 61].

Прыкладна тыя ж вынікі дало і даследаванне Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Згодна з ім, у 2016 г. «абсалютная большасць насельніцтва (95%) адносіць сябе да розных канфесій: праваслаўнай (84%), каталіцкай (8,5%), іншых (2,5%)» [5, с. 104].

Аднак гаворка тут ідзе пра самаідэнтыфікацыю. Калі ж пры аналізе рэлігійнасці ўлічыць такія больш аб'ектыўныя крытэрыі, як культавыя паводзіны, знаёмства са свяшчэннымі тэкстамі сваёй рэлігіі, веданне яе маральных нормаў і, што вельмі важна, гатоўнасць іх прытрымлівацца, то колькасць тых, каго можна вызначыць як вернікаў, істотна скарачаецца. Як правіла, людзі ахвотна заяўляюць аб сваёй рэлігійнай прыналежнасці, але гэта ніяк не праяўляецца ў іх паўсядзённых паводзінах. Так, па выніках даследавання, праведзенага ў 2016 г. Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам, была зроблена выснова аб тым, што «аналіз атрыманых дадзеных сведчыць пра перавагу намінальнай рэлігійнай свядомасці ў большасці рэспандэнтаў, якія аднеслі сябе да якой-небудзь рэлігіі. Так, сярод гэтай групы актыўна паводзяць сябе ў рэлігійным плане толькі 8% апытаных, у тым ліку пастаянна прымаюць удзел у набажэнствах 5%, адпраўленні ўсіх абрадаў і сакрамэнтаў — 3%» [5, с. 105].

Ва ўсіх даследаваннях характару рэлігійнасці насельніцтва Беларусі былі зроблены аднолькавыя высновы: 1) значная частка людзей заяўляе аб сваёй рэлігійнай прыналежнасці; 2) рэлігійнасць у Беларусі, як правіла, мае дэкларатыўны характар і не пацвярджаецца штодзённымі паводзінамі; 3) калі чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да рэлігіі, гаворка ў асноўным ідзе не аб рэлігійнай, але аб культурнай ідэнтыфікацыі. Гэта спалучаецца з распаўсюджанай да гэтага часу ў Беларусі схемай «праваслаўе — руская вера, каталіцтва — польская», у адпаведнасці з якой культурная арыентацыя вызначаецца рэлігійнай прыналежнасцю.

Асобна трэба сказаць аб перспектывах распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі так званых нетрадыцыйных рэлігій, з якімі яшчэ нядаўна звязвалася будучае рэлігійнай сітуацыі, прынамсі, у Еўропе. Трэба адзначыць, што гэтыя прагнозы не спраўдзіліся. Не будзе памылковым сцвярджэнне, што мода

на нетрадыцыйныя рэлігіі ўжо прайшла. Зараз нетрадыцыйных рэлігійных арганізацый на Беларусі мала, яны з'яўляюцца маргінальнымі для беларускага грамадства. Апроч таго, узнікненне і дзейнасць тых кірункаў, якія ўяўляюць сабой патэнцыйную пагрозу для грамадства, жорстка спыняецца праваахоўнымі органамі.

Пры разважанні аб трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі актуальнай з'яўляецца задача асэнсавання нашай традыцыі вальнадумства. Калі адбываюцца адмовы ад савецкай атэістычнай ідэалогіі, у якой рэлігія разглядалася як рэакцыйная з'ява, трэба пазбягаць небяспекі іншай крайнасці, калі рэлігійнаму светапогляду прыпісваюцца ўсе магчымыя станоўчыя якасці, а атэістычнаму — усе адмоўныя. Атэізм і вальнадумства з'яўляюцца неад'емнымі складнікамі еўрапейскай культурнай традыцыі. Дастаткова назваць імёны такіх мысляроў, як Русо, Вальтэр, Феербах, Расэл, Сартр. Вальнадумцы і атэісты былі таксама і ў Беларусі: С. Будны, С. Лован, К. Бекеш, К. Лышчынскі.

Таксама ў новых умовах павінна быць асэнсаваная крытыка рэлігіі, якая вялася ў савецкі перыяд. У гэты час быў пастаўлены шэраг пытанняў адносна ролі рэлігіі ў жыцці грамадства і асобнага чалавека, на якія ва ўмовах сучаснай Беларусі неабходна даць адказы.

Вельмі важна памятаць, што само функцыянаванне традыцыі вальнадумства і атэізму прадугледжвае наяўнасць у краіне пэўнай ступені свабоды думкі, а таксама вопыту палемікі паміж прыхільнікамі розных пунктаў погляду на рэлігію. У Савецкім Саюзе свабоды думкі не існавала, атэізм меў характар афіцыйнай ідэалогіі. Таму значная частка насельніцтва яго ўспрымала як нешта навязанае. Трансфармацыя рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі будзе спалучацца з пашырэннем светапогляднага плюралізму і ўзаемадзеяннем паміж людзьмі, якія прытрымліваюцца розных поглядаў на рэлігію.

У заключэнні скажам аб найбольш важных шляхах трансфармацыі.

Па-першае, гэта забеспячэнне свабоды сумлення. Праз гэты працэс будзе фарміравацца прынцыпова іншая ў параўнанні з Савецкім Саюзам грамадская сітуацыя. Сам факт прызнання правоў асобы задае новую перспектыву бачання шляхоў развіцця грамадства. Трэба адзначыць, што ў заканадаўстве сучаснай Беларусі праву на свабоду сумлення, як і іншым правам, надаецца вялікая ўвага. Праблема заключаецца ў тым, як заканадаўча замацаваныя прынцыпы ажыццявіць у грамадскім жыцці.

Па-другое, дзейнасць сучаснай беларускай дзяржавы ў канфесійнай сферы. На наш погляд, яе асноўны кірунак пазначаны ў наступным палажэнні Канцэпцыі дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь: «Удасканаленне дзяржаўнай палітыкі ў галіне міжнацыянальных і міжканфесійных адносін будзе заключацца ў забеспячэнні ўмоў для ўмацавання адзінай супольнасці "беларускі народ", выхаванні павагі да іншых нацыянальнасцяў, рэлігій і культур, спыненні любых спроб распальвання нацыянальнай і рэлігійнай варожасці» [6; 7].

Па-трэцяе, гэта дзейнасць саміх рэлігійных арганізацый і наладжванне дыялогу паміж імі. Апошні адбываецца зараз, яго асноўным ініцыятарам з'яўляецца Беларуская праваслаўная царква. Адбыліся тры міжнародныя канферэнцыі, прысвечаныя міжрэлігійнаму дыялогу: «Дыялог хрысціянства і ісламу ва ўмовах глабалізацыі» (2007), «Хрысціянска-іўдзейскі дыялог: хрысціянскія каштоўнасці як аснова ўзаемапавагі ў грамадзянскай супольнасці» (2009), «Праваслаўна-каталіцкі дыялог: хрысціянскія этычныя каштоўнасці як унёсак у сацыяльнае жыццё Еўропы» (2011).

Пры аналізе трансфармацыі рэлігійнай сферы ў сучаснай Беларусі нам трэба выходзіць з таго, што яна мае сістэмны характар і шчыльна звязана з пераўтварэннямі ў іншых сферах грамадства, перш за ўсё ў эканамічнай і палітычнай. Таму мэтазгодна разглядаць працэс трансфармацыі як пераход беларускай сістэмы грамадства ад аднаго стану да іншага.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Данилов, А. Н.* Переходное общество : проблемы системной трансформации / А. Н. Данилов. — Минск : Універсітэцкае, 1997. — 431 с.
2. *Шерис, А. В.* Влияние религиозного фактора на обеспечение национальной безопасности Республики Беларусь / А. В. Шерис. — Минск : Право и экономика, 2015. — 175 с.
3. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь : са змян. і дап. — Мінск : Беларусь, 2004. — 95 с.
4. Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях : Закон Рэсп. Беларусь. — Мінск : Беларусь, 2002. — 23 с.
5. Белорусское общество в контексте цивилизационно-культурного кода: социологическое измерение / И. В. Котляров [и др.] ; редкол.: И. В. Котляров (гл. ред.) [и др.]. — Минск : Беларус. навука, 2017. — 392 с.
6. Республика Беларусь в зеркале социологии : сб. материалов социол. исслед. за 2016 г. / А. В. Папуша [и др.] ; Информ.-аналит. центр при Администрации Президента Респ. Беларусь ; под общ. ред. А. П. Дербина. — Минск : Белорус. Дом печати, 2017. — 209 с.
7. Концепция национальной безопасности Республики Беларусь [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.sovrep.gov.by/index.php/.1.7943..0.0.0.html . — Дата доступа: 11.11.2018.